View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



**УДК 94(476.5)**

# ЖЫЛЛЁВА-ГАСПАДАРЧЫЯ КОПЛЕКСЫ XI-XVI стст. НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАПАЛОЦКАГА ПАСАДА СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА

***А.Л. КОЦ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Забудову любога горада фарміруюць сядзібныя комплексы. Адзначаецца, што сядзіба складалася з комплексу жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі і, магчыма, агародам і садам. У склад сядзібы маглі ўваходзіць і вытворчыя комплексы (майстэрні). За паўвекавую гісторыю вывучэння Запалоцкага пасада Полацка тут было зафіксавана 9 жыллёва-гаспадарчых комплексаў XI–XVI стст. З іх 6 належаць перыяду Полацкага княства і 3 датуюцца другой паловай XV – першай паловай XVI стст. Два жыллёва-гаспадарчых комплекса належалі мясцовым майстрам-ювелірам, яшчэ адзін захоўвае сляды рыбалоўнай здабычы мясцовых жыхароў. Пяць жыллёва-гаспадарчых комплексаў вызначаны толькі па наяўнасці жылых пабудоў, адзін з іх уваходзіў у склад бернардынскага манастыра. Яшчэ адзін жыллёва-гаспадарчы комплекс характарызуецца побач знаходак багатага гараджаніна.*

Асновай кожнага горада з’яўляецца грамадская забудова, якая складаецца з жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Полацк не з’яўляецца выключэннем. Полацкія пасады мелі разгалінаваную вулічную сістэму, якая фарміравала размяшчэнне сядзібаў. Кожная сядзіба знаходзілася на зямельным надзеле, які ў пісьмовых крыніцах XVII–XVIIIстст. называецца грунт або пляц. Памер пляца па падліках Д.У. Дука вызначаны ў дыяпазоне ад 1077 да 1236 м$^2$ [3, с. 12]. Сядзіба на пляцы ўключала ў сябе комплекс жылога дома з гаспадарчымі або вытворчымі пабудовамі і, магчыма, з агародам або прысадам. У склад сядзібы маглі ўваходзіць і вытворчыя комплексы, што сінанімічна тэрміну “майстэрня”. Пад “вытворчым комплексам” варта разумець сукупнасць храналагічных і тэрытарыяльна блізка размешчаных пабудоў, а таксама прастору, што іх акружае, і характар знаходак, якія ўказваюць на існаванне на дадзеным участку вытворчай дзейнасці [9, с. 115]. У сукупнасці ўсе вышэй акрэсленыя адзінкі сядзібы можна назваць жыллёва-гаспадарчым комплексам.

Запалоцкі пасад адыгрываў значную горадаўтваральную ролю ў старажытным Полацку. Археалагічныя даследаванні ўсходняй часткі Запалоцця праводзяцца з 1963 г. [4, с. 209], у той час як вывучэнне заходняй паловы пасада было распачата толькі ў 2004 г. [6, с. 108]. Жыллёва-гаспадарчыя комплексы або фрагменты асобных пабудоў XI–XVI стст. былі ўскрыты падчас правядзення раскопак С.В. Тарасавым у 1986 г., Д.У. Дукам у 2003 і ў 2010–2011 гг., А.А. Салаўёвым у 2001 г., аўтарам артыкула ў 2012, 2013 і 2015 гг. (мал.).




Малюнак. Картаграфія месцаў правядзення археалагічных даследаванняў Запалоцкага пасада з пазначэннем зафіксаваных жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Прамалёўка карты са спадарожнікавага здымка

Азначаная датыроўка для Запалоцкага пасада, як і для ўсяго Полацка з'яўляецца агульнапрынятай. У XI ст. пачынаецца актыўнае разрастанне Запалоцкага пасада. Ён становіцца адным з самых вялікіх пасадаў горада і адыгрывае выключную ролю ў фарміраванні гарадской тапаграфіі. Яго плошча ў XI–XII ст. дасягае больш 55 га. На мяжы XII–XIII стст. плошча Запалоцкага пасада рэзка скарачаецца да межаў сучаснага мікрараёна. У сярэдзіне XVI ст. у часе Лівонскай вайны Іван IV захоплівае Полацк і маштабна знямае яго планіроўку. У тапаграфіі горада з'яўляецца Ніжні замак для пражывання стральцоў. У сувязі з фарміраваннем абарончай сістэмы Верхняга замка Запалоцкі пасад быў цалкам знішчаны. Такім чынам, пасля Лівонскай вайны з другой паловы XVI ст. Запалоцце адбудоўваецца ўжо ў рэчышчы новых тэндэнцый тапаграфіі горада, што больш дасканала можна прасычыць на базе пісьмовых крыніц, чым археалагічных даных.

У 2012 г. у раскопе 4 былі зафіксаваны сляды жылой пабудовы і шэраг унікальных знаходак [7, С. 88–94]. Выяўлены аб'ект можна вызначыць як закрыты археалагічны комплекс.

У працэсе раскопак у паўночна-ўсходнім куце раскопа ў другім стратыграфічным гарызонце зафіксавана пляма правельнай формы. Сляды будынка прасочваюцца на глыбіні 0,3–0,6 м ад дзённай паверхні і ў мацерыковай яме 6. Сярэдняя магутнасць залягання культурнага пласта ў межах пабудовы каля 0,3 м. Верхні пласт ў межах пабудовы сфарміраваны з зямлі чорнага колеру з вуглем. Слой шчыльны, зляжалы. Дыперснае размяшчэнне вуглю па ўсёй плошчы будынка сведчыць аб яго знішчэнні падчас пажару. Магутнасць верхняга пласта 0,1–0,2 м. Ніжні пласт пабудовы сфарміраваны з цёмна-шэрага і чорнага культунага слою магутнасцю 0,1–0,13 м. У ім выяўлена праслойка сырой гліны з плямамі тэракоты і дзве вялікія плямы вугалю, што, верагодна, з'яўляецца рэшткамі печы. У межах пабудовы на ўзроўні трэцяга ўмоўнага пласта была выяўлена вялікая колькасць камянёў памерам 0,1–0,3 м, якія не мелі сістэмнага размяшчэння. Магчыма, гэта таксама сляды печы-каменкі.

Выяўлены дом выцягнуты па лініі паўночны-ўсход – паўднёвы-захад (пад 35$^{o}$ адносна лініі пн-пд). Зафіксаваны толькі заходні кут пабудовы (які развёрнуты на 110$^{o}$) і размыты паўднёвы кут (які закладзены пад 90$^{o}$). Даўжыня вызначаных сцен будынка 1,6 м і не менш 2,6 м. Дом уяўляў сабой зруб, пастаўлены на зямлю без асновы, яго ніжняя частка, магчыма, была заглыблена ў культурны слой на 0,1–0,2 м.

У паўднёва-заходняй частцы дома выяўлена мацерыковая яма. Агульныя памеры ямы: 1,7 × 1,9 м. Яма складаецца з трох асобных паглыбленняў, якія размяшчаюцца ў розных частках ямы. Верхні пласт запаўнення цэнтральнай часткі ямы – чырвоная гліна, перамяшаная з зямлёй, у асобных месцах гліна абпалена. Ніжні слой цэнтральнай часткі ямы – чорная зямля (гумус), перамяшаная з сырой і абпаленай глінай. У частцы 1 яма запоўнена чорна-шэрым культурным пластом з нязначнымі ўключэннямі гліны і вугалю, другая частка ямы запоўнена чорнай зямлёй з вялікай колькасцю вуголля, трэцяя частка запоўнена чорным культурным слоем з глінай і вуглем. У запаўненні ямы па ўсёй плошчы дысперсна размешчаюцца камяні球 рознага памеру (пераважна 0,1–0,3 м у папярэчніку). У частцы 1 знойдзена шыфернае прасліца і жалезны нож, у частцы 3 – злітак свінца. Таксама ў частцы 3 выяўлена значная колькасць керамікі, у тым ліку і венца XI – п.п. XII ст., у частцы 1 выяўлены толькі пяць сценак керамічных гаршкоў. Дадзеная яма сведчыць аб існаванні печы ў дадзенай пабудове і, магчыма, была зроблена для ўладкавання глінянай падушкай для асновы печы. Печ, верагодна, была зроблена з камянёў (печ-каменка), замацаваных растворам гліны (у ніжняй частцы). Пасля знікнення будынка, відавочна, што печ была разабрана на гаспадарчыя патрэбы. У межах жылой пабудовы выяўлена шмат керамічнага матэрыялу, які прадстаўлены рэшткамі кухоннага посуду XI–XII стст., а таксама шэраг індывідуальных археалагічных знаходак: лірападобная спражка X–XII стст., пласцінкі свінца, калечка ад кальчугі, два жалезныя нажы, разагнутае вушкам катла і фрагмент дротавага бранзалету кан. XII – пач.XIII стст.

Стратыграфія ўсяго раскопа 4 налічвае 3 выразныя гарызонты. Сярэдні і ніжні – сфарміраваліся ў часе функцыянавання пабудовы. Сярэдні стратыграфічны гарызонт цёмна-шэрага колеру. Яго магутнасць вагаецца ў межах 0,3–0,4 м. Па шчыльнасці зямля не рыхлая, зляжалая. У ніжняй частцы гарызонта ў паўночна-ўсходняй частцы раскопа зафіксавана праплачтка зямлі чорнага колеру з кавалкамі вугалю. Дадзены гарызонт утрымлівае найбольшую колькасць археалагічных знаходак. Тут пераважае кераміка – кухонны посуд, у асноўным фрагменты гаршкоў, побытавыя і культавыя рэчы XI–XII стст.: асялок, фрагменты скабяных вырабаў і іншыя жалезныя прадметы, жалезныя цвікі, у тым ліку адзін дэкаратыўны, падвеска з выявай княжаскага знака, нацельны крыжык, падвеска-ключык, падковападобная фібула, жалезны ключ, спражка, нарыхтоўкі і злiткі свінца, падвеска-сякерка, бранзалет, прасліца, нажы, шкляныя аплаўкі і інш. Азначаныя статусныя рэчы сведчаць аб прысутнасці на дадзенай тэрыторыі прадстаўнікоў высокага сацыяльнага статусу [6, с. 117]. Ніжні стратыграфічны гарызонт светла-шэрага колеру з карычневым адценнем, распаўсюджаны па ўсёй плошчы раскопа, акрамя паўночна-ўсходняй часткі (на дадзеным месцы сярэдні гарызонт са слядамі пабудовы залягае да мацерыка). Магутнасць ніжняга гарызонта 0,1–0,3 м. Глеба шчыльна зляжалая. Археалагічныя знаходкі прадстаўлены рэшткамі керамічнага посуду і індывідуальнымі знаходкамі ў дыяпазоне XI–XII стст.

Выяўленая падчас раскопак у 2012 г. пабудова ўяўляе сабой археалагічны коплекс – рэшткі зрубнага жылога драўлянага дома з печчу. Пабудова ўяўляла прамакутны зруб (зафіксаваны памер 1,6 × ≥2,6 м). У паўднёва-заходнім куце дома размешчана печ, якая была пастаўлена на гліняную падушку. Аснова печы заглыблена ніжэй узроўня падлогі і ўтварыла мацерыковую яму. Выяўленыя рэчы характарызуюць гаспадарчую дзейнаць жыхароў. Відавочна, што дадзеная пабудова загінула ў агні. Аналіз усіх выяўленых знаходак дае падставы выказаць меркаванне аб існаванні комплекса ў XI–XIIст.

У раскопе 1 у 1986 г. С.В. Тарасавым на Запалоцкім пасадзе былі выяўлены рэшткі наземнай каркасна-слупавой канструкцыі. Яе сляды прасочаюцца па выяўленых мацерыковых траншэях, шырынёю ў сярэднім 0,2 м. Зафіксаваны тры падобныя траншэі: дзве з іх пракладзены паралельна адна адной на адлегласці 2,8 м па лініі захад-усход на даўжыню больш 6 м. Яшчэ адна траншэя з заходняга боку злучае дзве вышэй узгаданыя траншэі і пракладзена перпендыкулярна ім. Яе даўжыня каля трох метраў. Такім чынам, яскрава фіксуюцца паўднёвая, заходняя і паўночная межы пабудовы. Зафіксаваная плошча дадзенага будынка не больш 20 м$^2$ [12, с. 3–4]. Верагодна, што яна мела нейкае гаспадарчае прызначэнне, у якім маглі захоўвацца прыпасы або сена.

Каля паўночна-ўсходняга боку дадзенай канструкцыі размяшчалася печ, якая была заглыблена ў мацярык. Глыбіня мацерыковай ямы 0,5 м. Печ выкладзена з невялікіх камянёў. Вакол паглыблення прасочваюцца сляды слупавой канструкцыі, якія маглі застацца ад драўлянага апечка на слупах. Рэшткі печы канструктыўна звязаны з мацерыковай ямай 3 (глыбіня да 0,4 м). Знаходкі з мацерыковай ямы прадстаўлены фрагментамі керамічнага посуду і тачыльным бруском. Відавочна, печ знаходзілася ў жылым доме, часткай якога з’яўлялася мацерыковая яма 3 [12, с. 4]. Азначаны дом мог прымыкаць да вышэйапісанай гаспадарчай пабудовы. Паводле керамічнага матэрыялу С.В. Тарасаў датуе печ і каркасна-слупавую канструкцыю XII–XIII стст. [12, с. 4]

У раскоп 2, які быў закладзены С.В. Тарасавым на заходняй ускраіне жылога сектара Запалоцкага пасада у 1986 г., выяўлены сляды мацерыковых ям і траншэй ад жылых пабудоў. Так ямы 3 і 5 апісаны даследчыкам як агнішча XII–XIII стст. У яме 2 зафіксаваны развал печы-каменкі, які прадатаваны XIII ст. У заходняй частцы раскопа выяўлены каменная вымастка і рэшткі драўлянай канструкцыі старажытнарускага часу. У паўночна-ўсходнім куце раскопа зафіксавана мацерыковая яма 16 і траншэяпадобныя паглыбленні, якія засталіся ад пабудовы XI–XII стст. У межах раскопа было зафіксавана не менш 5 фрагментаў жылых і гаспадарчых будынкаў. З агульнай колькасці ахарактарызаваных даследчыкам аб’ектаў нельга вызначыць сляды канкрэтных жыллёва-гаспадарчых комплексаў. Відавочна, што дадзеная пляцоўка неаднаразова забудоўвалася ў XI–XIII стст. [12, с. 7–9].

На сённяшні дзень на Запалоцкім пасадзе выяўлены два жыллёва-гаспадарчыя комлексы XII–XIII стст., якія сумяшчалі ў сабе жылую прастору і ювелірную вытворчасць.

Рэшткі адной такой жылой пабудовы былі выяўлены С.В. Трасавым у шурфе за 52 м на захад ад раскопа 2 1986 г. Культурныя напластаванні на месцы будынка сфарміраваны аднароднай чорнай глебай, якая перакрывае праслойку з вялікай колькасцю вугля і попелу. Месца пабудовы прыблізна вызначана па размяшчэнню мацерыковай ямы 1, якая з’яўлялася агнішчам. Вялікая гліняная лінза магутнасцю да 0,6 м сведчыць аб размяшчэнн тут глінабітнай печы. Вялікая колькасць керамікі, выяўленыя ўпрыгожванні і фрагменты ювелірных тыгляў сведчаць аб шырокім профіле дадзенага агнішча. Усяго тут выяўлена 2614 фрагментаў посуду. У агнішчы, у слое вугля і попелу выяўлены ключык ад навяснога цыліндрычнага замка, дужка ад вядра, прасліца, падвеска-лыжачка, бронзавы бранзалет, скаба, цвікі. Таксама найбольш цікавымі знаходкамі можна назваць фрагмент тыгля з рэшткамі бронзы на ўнутранай паверхні, скроневае кальцо, палавінка бронзавай полай пацеркі або бразготка. Знаходкі і вялікая колькаць керамікі сведчаць функцыянаванні сядзібы ў другой палове XII – пачатку XIII стст., жыццё на якой было вельмі інтэнсіўным. Відавочна, што мацерыковая яма I і слой гліны з’яўляюцца рэшткамі печы, якая выкарытоўвалася для прыгатавання ежы і для вырабу ювелірных упрыгожванняў [12, с. 12]. Дадзены комплекс археалагічных знаходак вызначаны І.У. Магалінскім як сляды ювелірнай вытворчасці.

У 2013 г. побач з будаўніцтвам раскрыжавання новых вуліц мікрараёна Аэрадром (адна з іх праспект Міра), на паўночна-заходняй ускраіне Запалоцця ў раскопе 6 быў выяўлены яшчэ адзін жыллёва-гаспадарчы комплекс. Ён складаўся з пабудовы, якая з’яўлялася жылым домам і аднячасова ювелірнай мастэрняй [8, с. 18–27]. Выяўлены жыллёва-гаспадарчы комплекс – гэта першая ювелірная майстэрня, якая была выяўлена на перыферыі Запалоцкага пасада. Астатнія ювелірныя комплексы зафіксаваны толькі ў цэнтры Вялікага пасада або на Верхнім замку.

Стратыграфія раскопа налічвае два выразныя гарызонты. Верхні ўяўляе сабой шчыльную глебу, пераважна цёмнакарычневага колеру з украпінамі дробных рэдкіх вугольчыкаў і чырвонай гліны. Магутнасць пласта вагаецца ў межах 0,1–0,3 м. Ніжні стратыгрыфічны гарызонт падзяляецца на два прапластка. Першы прапластак – чорны гумусавы слой, другі прапластак – перадмацерыковы слой. Ён пераважна чорнага колеру, магутнасцю да 0,1 м, амаль не ўтрымлівае археалагічных знаходак, за выключэннем рэдкіх фрагментаў керамікі старажытнарускага перыяду. Гумусавы слой (першыпрапластак)

магутнасцю 0,3–0,4 м мае цёмна-шэры колер і плямы насычанага чорнага колеру. Ён сфарміраваўся падчас актыўнай дзейнасці гаспадароў сядзібы. У ніжнім стратыграфічным гарызонце, у гумусавым слое былі выяўлены сляды пабудовы. Яны зафіксаваны ў выглядзе прамакутніка памерамі 5 × 3,3 м, запоўненага чорнай гумусіраванай зямлёй з украпінамі вугалю і гліны. У цэнтры была выяўлена пляма гумусавай глебы няправільнай формы (прыбліжанай да круга), памерамі 1,8 × 1,6 м. Ніжэй на глыбіні 0,5 м ад дзённай паверхні сляды пабудовы працягваюць захоўвацца, але яго памеры памяншаюцца (3,8 × 2,8 м). Дадзены аб'ект запоўнены насычанай чорнай зямлёй з украпінамі вугалю і гліны. Захоўваюцца таксама лінзы гумусу з развалам камянёў памерам 1,4 × 1,3 м. У межах будынка фіксуецца пласт у выглядзе плямы паўкруглай формы, запоўнены чырвонай аднароднай глінай (памер 2,4 × 1 м). На ўзроўні мацерыка ў пабудове была выяўлена мацерыковая яма 3, якая засталася ад развалу печы. Максімальная глыбіня ямы дасягае каля 0,9 м. Сценкі ямы пакатыя, плаўна звужаюцца да дна. Памер ямы ўверсе 2,5 × 2,5 м, ніжняй часткі ямы – 1,6 × 1 м. Яма запоўнена зямлёй чорнага насычанага колеру з украпінамі гліны, перамяшанай з дробнымі каменчыкамі. У запаўненні ямы прысутнічае вялікая колькасць камянёў дыяметрам каля 15 см і металургічнага шлака. Некаторыя камяні перапалены. У запаўненні ямы сярод камянёў таксама прысутнічае вялікая колькасць кавалкаў керамічнага посуду, толькі ў ніжняй частцы ямы былі знойдзены адзінкавыя фрагменты керамікі.

Падчас раскопак былі знойдзены фрагменты тыгляў у колькасці 16 шт, з іх 5 не былі выкарыстаныя. Сярод артэфактаў былі выяўлены 4 венца і два донца ад талерачак, у якіх ажыццяўлялся плаўка метала. Таксама была выяўлена адна льячка. Яшчэ выяўлены два артэфакты, якія непасрэдна тычацца ювелірнай вытворчасці: бракаваная лунніца і форма (матрыца) для выплаўкі васкавых мадэляў. У раскопе была выяўлена вялікая колькасць рэчаў няпэўнай формы, якія можна вызначыць як нарыхтоўкі (пласцінкі, палоскі і інш), дрот, аплаўкі і адыходы ювелірнай вытворчасці са свінцова-алавяністых сплаваў і сплаваў на аснове медзі. Акрамя таго, быў выяўлены шэраг прадметаў з каляровага металу: грузікі, падковападобная фібула, бразготкі (адна фрагментаваная), элементы паясной фурнітуры, нацельны крыжык, бранзалет пласцінчаты, фрагмент жаночага ўпрыгожвання невядомага прызначэння, падвеска-лунніца. Відавочна, што гаспадар дома займаўся вырабам ювелірных упрыгожванняў. Былі вызначаны наступныя тэхналагічныя прыёмы ювелірнай вытворчасці: тэхніка купеляцыі (аддзялення каштоўных металаў ад дамешкаў), плаўка сплаву на аснове медзі ў тыглях-льячках, выплаўка паясных накладак праз выраб васкавых мадэляў, выраб палавінак бразготак з ліста і далейшае іх спайванне (?).

У пабудове знойдзена вялікая колькасць побытавых рэчаў: нажы, шыферныя праселкі, засоў унутранага замка, іголка, асялкі і інш. Шыферныя праселкі і іголка сведчаць аб прысутнасці жанчыны ў жылой прасторы пабудовы. Побач з домам (на адлегласці 11 м на ўсход) знойдзена праселка з надпісам "МАСТА". Таксама ў культурным пласце па ўсёй плошчы дома было знойдзена шмат фрагментаў керамікі, асаблівая канцэнтрацыя назіралася ў межах печы і ў непасрэднай блізкасці з ёй.

Усе вышэй пералічаныя прыкметы гаспадарчай дзейнасці надзейна могуць маркіраваць выяўленую пабудову як жылы дом. Дом размешчаны па лініі паўночны-захад, паўднёвы-ўсход (пад 74$^{o}$ адносна лініі пн-пд). Памеры дома ў даўжыню каля 5 м і каля 3 метраў у шырыню, даўжэйшым бокам па лініі паўночны-захад–паўднёвы-ўсход. Дом уяўляў сабой зруб пастаўлены на зямлю без асновы. Цэнтральная частка дома была заглыблена ў мацярык на 0,2–0,4 м. Вялікая колькасць вугалю па ўсёй плошчы раскопа сведчыць, што пабудова была знішчана агнём. Цэнтральнай адзінкай жылой прасторы была печ. Печ знаходзілася ў цэнтры і відавочна займала не менш чым 1/3 ад жылой прасторы дома. Яна была зроблена з камянёў, пакладзеных без рошчыны, толькі ў верхняй частцы была выкарыстана гліна. Акрамя гліны і камянёў пры будаўніцтве (ці рамонце) печы шырока быў выкарыстаны металургічны шлак і рэдкія фрагменты плінфы. Печ была заглыблена ў мацярык на 0,9 м. На месцы печы і ў запаўненні мацерыковай ямы была знойдзена вялікая колькасць керамікі (фрагментаў гаршкоў і абпаленай глінянай абмазкі печы), шлаку, які ў большасці выпадкаў быў злучаны з глінянай абмазкай. Фрагменты керамічнага посуду з нагарам сведчаць аб выкарыстанні печы для прыгатавання ежы. Канструктыўныя асаблівасці печы даюць падставы сцвярджаць аб яе ўніверсальным прызначэнні, у тым ліку ў якасці горна. У запаўненні мацерыковай ямы на месцы печы знойдзена вялікая колькасць металургічнага шлаку, які сведчыць аб ліцейнай дзейнасці майстра, і вялікая колькасць камянёў, дзякуючы якім майстар мог працяглы час падтрымліваць тэмпературу ў горне падчас плаўкі металаў.

Пабудова ювеліра сумяшчала жылую прастору і рабочую зону. Відавочна, што ў доме жыла ўся сям'я ювеліра. Гаспадарчую дзейнасць характарызуюць выяўленыя побытавыя рэчы: нажы, шыферныя праселкі, іголка, асялкі, шыферныя праселкі, іголка і інш. Прыведзеныя дадзеныя сведчаць аб высокім узроўні навыкаў майстра-ювеліра. Аналіз усіх выяўленых знаходак дае падставы выказаць меркаванне аб існаванні комплекса ў межах XII ст. Відавочна, што майстэрня існавала не вельмі працяглы час, пасля чаго загінула ў агні.

Яшчэ адзін жылы комплекс быў ускрыты за 150 м ад усходняй ускраіне жылога сектара Запалоцця. У ракопе 7 у 2015 г. у паўднёва-ўсходнім куце была выяўлена мацерыковая яма 2, сляды якой

прасочваліся і ў верхніх культурных напластаваннях у выглядзе асобных плям. Дадзены аб'ект раскапаны часткова. Яго можна вызначыць як асобны археалагічны комплекс, які з'яўляецца рэштакамі жылой драўлянай пабудовы. Падчас зачыстак верхніх пластоў фіксуюцца няпэўныя абрысы, але выразны контур будынка не прасочваецца. Знешнія абрысы аб'екта і мацерыковай ямы 2 прыбліжаны да прамакутнай формы, у межах якой залягаюць культурныя напластаванні азначанай пабудовы. Верхнія слаі сфарміраваны з чорнай з вуглем (і глінай) глебы, якія перамяжоўваюцца з магутнай (да 0,3–0,4 м) светла-карычневай праслойкай. З паўночна-заходняга боку з вызначанага аб'екта (па-за яго межамі) у верхніх слаях сфарміравалася пляма няправельнай формы (памерам 1 × 0,8 м) насычанага чорнага колеру з вялікім утрыманнем вуглю. Тут сабрана вялікая колькасць керамікі (у тым ліку і буйныя фрагменты). Магчыма, што гэта сляды печы, але рэштак каменных канструкцый ці гліны не выяўлена. Ніжэй залягае праслойка пяску, якая перакрывае цёмна-шэрую і чорную (у цэнтры аб'екта) праслойку глебы з масай вуглю, дзе выяўлена вялікая колькасць керамікі, тут жа знойдзены развал фрагментаў амфар. У дадзеным слоі фіксуецца круглая лінза гліны (магутнасцю да 0,1–0,15 м). Магчыма, гэта ні што іншае як рэшткі печышча (або агнішча), якія былі разабраны пасля знішчэння будынка. Ніжэй узроўня мацерыка культурныя напластаванні мацерыковай ямы 2 складаюцца са слою цёмна-шэрай глебы з масай вуглю, ніжэй ідзе паслойнае перамежаванне гліны і пяску. На дне ямы 2 культурны слой цёмна-шэрага колеру з украпінамі пяску і чорнай зямлі. Дно ямы мае невялікі ўхіл ад краёў да цэнтра, але цэнтр дна ямы плоскі. Сценкі мацерыковай ямы стромкія. На дне мацерыковай ямы каля паўночнай сценкі выяўлена вымастка з камянёў (дыяметрам да 0,25 см). У цэнтры раскапанай часткі ямы 2 выяўлены вялікі валун на мацерыку. Ён мае памер каля 0,45 м у папярэчніку, вышыня не зафіксавана. Прызначэнне дадзенага камня не вызначана. Максімальная глыбіня ямы 2–0,9 м ад узроўня мацерыка. Агульныя магутнасць культурнага пласта (з улікам мецерыковай ямы) у выяўленым аб'екце складае каля 1,8 м. На аснове вертыкальнай стратыграфіі можна вызначыць, што аб'ект фарміраваўся вельмі працяглы час. Мацерыковая яма запаўнялася паступова ў часе яе існавання. У верхніх пластах назіраецца прасяданне культурнага слоя у цэнтры. З паўночнага боку ад пабудовы быў сфарміраваны абарончы вал і роў. Вал чаткова быў насыпаны на паўночную сцяну пабудовы. У іншых месцах таксама ніжнія часткі сцен, магчыма, былі абсыпаны пяском. Археалагічныя знаходкі з аб'екта прадстаўлены фрагментамі амфар і адным развалам верхняй часткі амфары, фрагментамі керамічных паліваных плітак, фрагментамі керамічных гаршкоў.

Відавочна, што выяўлены аб'ект і мацерыковая яма 2 – гэта рэшткі жылой пабудовы (дома) з глінабітнай печчу. У раскопе 7 выяўлены паўночна-заходні кут будынка (даўжыня паўночнай сцяны каля 2 м, заходняй сцяны – каля 1,9 м). Ён пастаўлены па старанах свету з невялікім адхіленнем на паўночны захад. Пад домам размяшчаўся глыбокі склеп. Пабудова праіснавала працягы час. Магчыма, яна згарэла ў моцным агні і пасля была адноўлена прыблізна на гэтым жа месцы, аб чым сведчаць выяўленыя побач рэшткі агнішча ў верхніх слаях.

У 2001 г. А.А. Салаўёвам былі праведзены даследаванні на месцы пракладкі траншэй пад цеплапровад праз тэрыторыю Запалоцкага пасада (уздоўж вуліцы Шанягіна). Ім была зафіксавана мацерыковая яма, якая была зроблена на месцы двух розначасовых пабудоў [11][1].

Ад першай пабудовы захавалася мацерыковая яма (умоўна пазначана як ніжняя мацерыковая яма). Яе верхні ўзровень залягаў на глыбіні 1,2–1,3 м ад дзённай паверхні. Глыбіня ямы каля 1 м. Яе даўжыня прасочвалася на адлегласці 1,3 м. Зафіксавана паўднёвая сценка ямы, якая мела ўхіл вонкі і плоскае дно. Яма запоўнена светла-шэрай зямлёй з пяском, фіксуюцца праслойкі пяску. Пясчаны мацярык забяспечваў сухое дно ямы. Паводле меркавання А.А. Салаўёва, гэта яма з'яўлялася часткай зрубнай жылой пабудовы і выконвала ролю земляного склепа пад падлогай дома [11].

А.А. Салаўёў прасочвае паралельнасць жылых будынкаў з падобнымі падполлямі з драўлянымі дамамі XI–XII стст., якія былі зафіксаваны на "паселішчах за ракой Палатой" [10, с. 117, 118], г.зн. у непасрэднай блізасці ад даследаванага месца. Пабудова з падклетам была выяўлена ў раскопе 7 у 2015 г. (глядзі апісанне вышэй). Гэта падцвярджае шырокае распаўсюджанне традыцыі будаўніцтва драўляных дамоў з землянымі склепамі пад падлогай.

Найбольшы інтарэс уяўляў сабой другі будынак, які быў ўзведзен на месцы папярэдняй пабудовы з падполлем. Ад яго захавалася мацерыковая яма (умоўна пазначана як верхняя мацерыковая яма). Яе сляды прасочваліся як на заходняй, так і на паўночнай сценках траншэй пад цеплапровад. Сценкі ямы былі вертыкальнымі, дно гарызантальнае. Відавочна, што дадзеная яма з'яўлялася часткай драўлянай пабудовы. Яе сляды прасочваліся на пляцоўцы памерам каля 3,5 м (па лініі поўнач-поўдзень) і каля 0,5–0,6 м (па лініі захад-усход). Агульная плошча ўскрытай часткі ямы (і пабудовы) каля 2 $м^2$. Культурны слой у верхняй частцы мацерыковай ямы ўяўляў сабой перамяшаны аднародны культурны слой, які па ўсёй плошчы перакрываў яе. Ніжэй да дна ямы залягаў вугальны слой (магутнасцю 0,1–0,2 м), які ўтрым-

[1] Выказваем шчырую падзяку супрацоўніку Полацкага музея-запаведніка А.А. Салаўёву за магчымасць карыстацца неапублікаванымі матэрыяламі даследаванняў.

ліваў артэфакты пашкоджаныя агнём. Відавочна, сляды пажару дадзенай пабудовы. Пабудова была заглыблена ў зямлю і магла мець сцены зрубнай або слупавой канструкцыі, якія звонку ў ніжняй частцы абсыпаліся зямлёю для ўцяплення. Пабудова мела земляную падлогу, якая першапачаткова была роўнай, але пазней па характару культурнага пласта сфарміравалася паглыбленне ў цэнтры будынка. Выяўленыя жорны маглі ўказваць месца размяшчэння ўваходу ў пабудову з паўднёвага боку. На заходняй сценцы пабудовы, хутчэй за ўсё, віселі згарэўшыя ў пажары рыбалоўныя снасці (сеці з керамічнымі грузіламі) [11].

Даследчыкам вызначана, што даўжыня старон пабудовы не перавышала 4–5 м, такім чынам, плошчу будынка можна вызначыць у межах 15–25 м$^2$. Датыроўку дадзенай пабудовы, паводле керамічнага матэрыялу, можна вызначыць у межах канца XV – сярэдзіны XVI стст. і магла загінуць у час Лівонскай вайны [11].

Паводле А.А. Салаўёва, яна была жылой і старанна ўцеплена, але рэштак печы не зафіксавана (магчыма, яна была знішчана падчас будаўнічых работ). Відавочна, што дадзеная пабудова належыла мясцоваму рыбаку. Інвентар указвае толькі на асноўны занятак гаспадара сядзібы – рыбалоўства. Як лічыць А.А. Салаўёў, размяшчэнне рыбацкай пабудовы на дадзенай тэрыторыі цалкам заканамерна, паколькі найбольш прывабным месцам для засялення мясцовай элітай было пабярэжжа Заходняй Дзвіны. Рыбацкая пабудова размяшчалася каля самай пасадскай сцяны са рвом на поўнач ад Запалоцкага пасада [11].

Дадзеныя дзве пабудовы пазначаюць месца лакалізацыі, відавочна, жылых дамоў гараджан. Іх “накладанне” можна інтэрпратаваць як пераемнасць традыцыі будаўніцтва жылога дома на сядзібе ў адным месцы. Такім чынам, мы бачым устойлівасць фарміравання жыллёва-гаспадарчых комплексаў ад XI–XIII стст. да сярэдзіны XVI ст., якая характэрна для сядзібаў Запалоцкага пасада.

У шурфе 1 (2003 г.) на тэрыторыі паўночнай часткі Запалоцкага пасада Д.У. Дукам былі выяўлены рэшткі печы і шэраг знаходак, якія характарызуюць жыллёвую прастору палачан у XV ст. Шурф быў закладзены за 90 м на паўночны-захад ад выгіну ракі Палаты каля Машны (паўночная частка Верхняга замка).

Найбольш цікавым аб’ектам, выяўленым у шурфе, была печ. Яна залягала на глыбіні 1–1,2 м ад дзённай паверхні і размяшчалася ў заходняй частцы шурфа 1. Печ была перакрыта пластом чырвонага суглінку сярэдняга стратыграфічнага гарызонта, які мог сфарміравацца ў выніку разбурэння верхняй часткі печы. Печ арыентавана па накірунку паўночны-ўсход – паўднёвы-захад [2, с. 104]. Магчыма, што па гэтых жа накірунках мог быць арыентаваны дом, у якім яна знаходзілася.

Печ ўяўляла сабой прамакутнік памерамі 1,1 × 0,8 м. Сценкі печы мелі таўшчыню 0,2 м і вышыню 0,3 м і зроблены з чырвонай гліны, вапны, камянёў розных памераў, цэглы і цаглянага друзу [2, с. 104]. Для будаўніцтва печы выкарыстоўваўся розны спадручны матэрыял: цэгла другаснага выкарыстання, камяні памерам да 0,2 м. Пры гэтым вызначанай сістэмы ў тэхніцы будаўніцтва не зафіксавана. Паўднёва-ўсходняя сценка была зроблена з нізкаякаснай (дрэнна абпаленай) цэглы рознай шырыні (ад 22 да 10 см). Магчыма, што для будаўніцтва печы выкарыстоўвалася не толькі цэгла, але і плінфа. Пры будаўніцтве таксама выкарыстоўвалася гаршковая кафля (дыяметры венцаў 14 см і донцаў 8 см, вышыня каля 20 см). Кафля сфармавана на ручным ганчарным коле [2, с. 105].

Вусце печы выходзіла на паўднёвы-захад. Рабочая (унутраная) частка печы займала прастору 0,45 × 0,75 м. Вусце печы мела шырыню каля 0,2 м. Знутры печы, каля вусця, зроблена вымастка з камянёў 10 × 15 см дзвюх цаглін. Фрагмент дугі печы, які, верагодна, з’яўляўся скляпеннем вусця, прадстаўляе сабой выгнутую цагліну. Яна была пашкоджана агнём у выніку доўгага тэрмічнага ўздзеяння. Магчыма, што даўжыня дугі-цэглы магла дасягаць 20–25 см, радыус закруглення – каля 9 см [2, с. 105].

Аснова печы была зроблена з цёмна-шэрага з чырвоным адценнем суглінку з дабаўленнем рачнога пяску і вапны, які ўтвараў свайго роду падлогу [2, с. 105]. Пляцоўка дадзенай падлогі пашырана за межы печы. Магчыма, што спачатку быў сфарміраваны шырокі под, на якім у пэўным месцы была пастаўлена печ.

Печ была пастаўлена на цёмна-шэры, камкаваты, вільготны пласт гумусу (магутнасцю да 0,3 м), з лінзамі да 0,1 см чырвонай будаўнічай гліны. Пасярэдзіне ў дадзеным пласце залягае слой вымасткі з камянёў (да 10 см у папярэчніку) і цаглянага друзу. Дадзены пласт быў створаны штучна, як аснова (“падмурак”) для печы. Такім чынам, под (ніз) печы знаходзіўся на невялікім (да 0,3–0,4 м узвышэнні). Вакол печы сфарміраваўся культурны слой светла-шэрага колеру. Знаходкі з дадзенага слою (пус ейпі, фрагменты макотры, венца гаршкоў) датуюцца ў дыяпазоне XV ст.

Датаванне апісанай печы Д.У. Дук вызначае па знодзеным артэфактам (кафля і цэгла) і па культурнаму пласту каля печы. Керамічны посуд датуе рэшткі комплекса ў межах XV ст. Выяўленая кафля датуецца перыядам XIV–XV стст., але ў межах азначанага комплексу яна мае датыроўку XV ст.

Культурны пласт шурфа складаецца з трох стратыграфічных гарызонтаў. У верхнім пласце былі выяўлены рэшткі будаўнічага матэрыялу (камяні, бітая цэгла, драўляная парахня і інш). Сярэдні стратыграфічны гарызонт прадстаўлены праплasткай шчыльнага камкаватага суглінку магутнасцю ў сярэднім 0,15–0,18 м. У асобных месцах пласт суглінку перакрывае праплaстка вугалю магутнасцю 0,05–0,1 м. Прапластка суглінку мае чырвоны колер і пачынаецца з глыбіні 0,6–1,1 м. У гэтай пра-

пластцы зафіксаваны лінзы вапны. Тут знойдзены посуд, зроблены на ручным ганчарным крузе, канцаXV – п.п. XVI стст. і 2 фрагменты паўпразрыстага шкла зялёнага колеру ад ваконных шыбак. Асаблівую цікавасць прадстаўляе фрагмент сценкі керамічнага начыння з геаметрычным малюнкам. Звонку выраб пакрыты эмаллю цёмна-сіняга і светла-сіняга колеру, знутры – эмаллю шэрага колеру. Відавочна, што гэта імпартная турэцкая кераміка XVI ст. Ніжні стратыграфічны гарызонт прадстаўлены супеззю жоўтага колеру, з зеленаватым адценнем каля мацерыка. Знаходкі прадстаўлены рэдкімі фрагментамі сценак начынняў.

Такім чынам, выяўленая печ з'яўляецца закрытым комплексам, які можна выступаць як фрагмент жыллёва-гаспадарчага комплекса XV ст. Адсутнасць у печы цэлых кафляў і наяўнасць нешматлікіх фрагментаў сведчыць аб тым, што на пэўным этапе (пасля існавання сядзібы) печ была старанна разабрана да асновы [2, с. 105]. Знаходкі вызначаюць толькі асобныя рысы жылой прасторы, у якой знахозілася печ. Магчыма, што вокны былі зашклёны шыбамі і гаспадары ў сваім карыстанні мелі як мясцовы посуд, так і дарагі імпартны. Даследаванае месца Д.У. Дук суадносіць з месцам жыхарства заможных гараджан і выяўлены комплекс вызначае як феадальную сядзібуXV ст. [2, с. 106].

У 2010–2011 гг. Д.У. Дукам (у раскопах 1 і 2) была даследавана пляцоўка ў непасрэднай блізасці ад Верхняга замка, за 165 м ад вусця ракі Палаты. У XI–XIII стст. дадзеная тэрыторыя была шчыльна забудавана, аб чым сведчыць шэраг мацерыковых ям і траншэй. Выразна вызначаных будынкаў і комплексаў тут не зафіксавана. Знаходкі XI–XIII ст. сведчаць пра гандлёва-рамесны характар заняткаў жыхароў дадзенай часткі Запалоцкага пасада. У гэты час на дадзенай тэрыторыі сяліліся і прадстаўнікі сацыяльных эліт [1, с. 64]. Што падцвярджае размяшчэнне забудовы ўздоўж галоўнай выліцы пасада, якая з XVII ст. мела назву Вялікай [5, с. 178].

У раскопе 2 ускрыта частка пабудовы з захаванай асновай печы з гаршковай і сценавай кафлі канца XV – першай паловы XVI стст. Яна перакрывала папярэднія напластаванні XI–XIII стст. Пабудова загінула ў агні ў першай палове ці сярэдзіне XVI ст. [1, с. 61]. Ад комплексу пабудовы захаваліся драўляныя згарэлыя плахі падлогі. Яны пакладзены па лініі захад-усход. Шырыня плах дсягае 0,38 м, даўжыня 1,2 м, тыўшчыня 0,1 м. Вакол плах зафіксаваны пласт вугалю магутнасцю 0,1 м. Вызначальным маркерам пабудовы з'яўляецца печ. Верхняя яе адметка зафіксавана па вугальнай праслойцы і круглай (дыяметрам 0,8 м) лінзе гліны з супескам. Памер асновы печы (1,8 × 3,17 м) складаецца з глінянапясчанага слою. Печ выцягнута па лініі захад-усход. У цэнтры печы пасярэдзіне зафіксавана лінза вугалю дыяметрам 0,5 м. Па перыметры асновы фіксуюцца вугальныя ўкрапіны. Таксама асобныя лінзы вугалю (дыяметрам 0,2 м) фіксуюцца вакол печы [1, с. 56]. Знаходкі XV–XVI стст. сведчаць аб прыналежнасці іх уладальнікаў (жыхароў выяўленай пабудовы) да кола людзей, арыентаваных на цэнтральнаеўрапейскія культурныя традыцыі [1, с. 61]. Д.У. Дук на аснове атрыманых археалагічных дадзеных і пісьмовых крыніц вызначае, што ў раскопе ўскрыта частка жылога корпуса бернардзіскага кляштара 1498–1563 гг. [1, с. 62].

Такім чынам, на сённяшні дзень на тэрыторыі Запалоцкага пасада зафіксаваны сляды як мінімум 9 сядзібных комплексаў. З іх 6 комплексаў можна аднесці да перыяду Полацкага княства і яны датуюцца XI–XIII стст. 3 комплексы прадатаваны другой паловай XV – першай паловай XVI стст. Пабудоў XIV – першай паловы XV стст. не выяўлена. Было вызначана, што два жыллёва-гаспадарчыя комплексы належалі мясцовым рамеснікам-ювелірам, яшчэ адзін захоўвае сляды заняткаў жыхароў рыбалоўным промыслам. Пяць жыллёва-гаспадарчых комплексаў вызначаны толькі жылымі будынкамі, адзін з іх уваходзіў у склад бернардзінскага кляштара. Яшчэ адзін жыллёва-гаспадарчы комплекс характарызуецца кафляной печчу і шэрагам артэфактаў, характэрных для заможняга гараджаніна.

Стан захаванасці арганічных рэчываў на Запалоцкім пасадзе вельмі дрэнны ў параўнанні з Верхнім замкам (раскопкі 1959–1964 гг.) і цэнтральнай часткай Вялікага пасада (раскопкі 1986 і 2009 гг.). Так, з усіх жыллёва-гаспадарчых комплексаў Запалоцця толькі ў жылым будынку бернардзінскага кляштара былі выяўлены рэшткі драўлянай падлогі. У першую чаргу гэта тлумачыцца невялікім культурным слоем і пясчаным мацерыком, які не ўтрымлівае вільгаць. Сляды пабудоў вызначаюцца толькі па наяўнасці мацерыковых ям, вугальных праслойках, запаўненні аб'ектаў ці па характары культурных напластаванняў у сукупнасці з комплексам археалагічных знаходак.

Археалагічныя матэрыялы Запалоцкага пасада акрэсліваюць толькі асобныя прыкметы ўзвядзення будынкаў. Так, у некаторых выпадках ніжнія вянцы дамоў маглі падсыпацца пяском або заглыбляцца ў зямлю на 0,2–0,3 м, відавочна, для ўцяплення. Прасочваецца шырокае распаўсюджанне традыцыі будаўніцтва драўляных дамоў з землянымі склепамі пад падлогай. На Запалоцкім пасадзе выразна фіксуецца трывалая традыцыя ў будаўніцтве дамоў на адным і тым жа месцы на працягу ўсяго разглядаемага перыяду. Гэта таксама падцвярджаецца ўстойлівасцю развіцця вулічнай сеткі, што характэрна для ўсяго Полацка.

ЛІТАРАТУРА

1. Дук, Д.У. Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2007–2012 гг.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – 248 с.

2. Дук, Д.У. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2006. – № 11. –С. 104–113.
3. Дук, Д.В. Городское пространство и социальная топография Полоцка по данным ревизии 1765 года / Д.В. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитаные науки. – 2015. – № 9. – С. 2–13.
4. Дук, Д.У. Полацкі Запалоцкі пасад / Д.У. Дук // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л – Я. – С. 208–209.
5. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с.
6. Дук, Д.У. Унікальны помнік археалогіі – заходняя частка Запалоцкага пасада Полацка: праблемы аховы і вывучэння / Д.У. Дук // Гісторыя і археалогі Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VI Міжнар. канф., Полацк 1–3 лістапада 2012 г. : у 2 ч. – Полацк : НПГКМЗ, 2013. – Ч. 1. – С. 108–119.
7. Коц, А.Л. Археалагічны комплекс XI–XII ст. на Запалоцкім пасадзе Полацка (па матэрыялах раскопак 2012 г.) // А.Л. Коц // История и культура на стыке эпох и цивилизаций: историко-культурное наследие как ресурс и результат развития общества : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвященной 250-летию М.К. Огинского / рэд.кол.: И.И. Калачева [и др.]. – Минск, 2015. – С. 88–94.
8. Коц, А.Л. Ювелірная майстэрня XII ст. на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка (па матэрыялах археалагічных раскопак 2013 г.) / Коц А.Л. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитаные науки. – 2015. – № 1. – С. 18–27.
9. Магалінскі, І.У. Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X–XVII стст.) / І.У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 21 : Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – С. 115–121.
10. Салаўёў, А.А. Да вынікаў археалагічных даследаванняў на вуліцы і завулках Ф. Міронавай у 2005–2006 гг. / А.А. Салаўёў // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў (да 160-годдзя з дня нараджэння А. П. Сапунова) : зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красав. 2011 г. : у 2 ч. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 114 – 124.
11. Соловьёв, А.А. Итоги археологического наблюдения за прокладкой теплотрассы в 2001 г. по ул. Шенягина / А.А. Соловьёв. – статья находится в печати (сборник Полацкі музейны штогоднік).
12. Тарасов, С.В. Отчёт о раскопках в г. Полоцке в 1986 г. / С.В. Тарасов. – Фонд археологической научной документации Центрального Научного Архива НАН Беаруси. Д. № 953.

## THE ESTATE COMPLEXES WITHIN THE TERRITORY OF ZAPALOCKI PASAD IN THE ANCIENT POLACK

***A. KOTS***

*The development of any city is formed by estate complexes. An estate consisted of a house complex probably with a vegetable and fruit garden. A manufacturing complexs (workshops) could be a part of an estate. All the mentioned estate elements altogether can be defined as a housing and econimic complex. For more than 50 years of study of Zapalocki pasad in Polack nine estate complexes of the XI–XVI centuries were recorded. Six of the estate complexes go back to the Polack Principality and tree ones date back to the latter half of XV – the first half of the XVI centuries. Two housing and economic complexes belong to the local jewelers, one of the estates has a vestige of local fishery. Five housing and economic complexes are defined only by the presence of residential buildings, one of them was a part of the Bernardine monastery. Another housing and economic complex is characterized by several findings owned by a rich citizen.*

Polotsk SU